# ІНСТРУКЦЫЯ
# як падаць праект на конкурс Люблін Еўрапейская сталіца культуры 2029

ЛЮБЛІН ЕЎРАПЕСКАЯ СТАЛІЦА КУЛЬТУРЫ 2029
**REUNION LUBLIN**

## Чаму RE-UNIA?

Re-unia – гэта адсылка да канцэпцыі Люблінскай уніі – мірнага аб'яднання Польшчы і Вялікага Княства Літоўскага, якое адбылося шляхам злучэння і прызнання аўтаноміі абодвух дзяржаўных утварэнняў. Гістарычная перспектыва з'яўляецца для Люблiна тым адпраўным пунктам, з якога адбываецца перагляд панятку уніі і нараджаюцца развагі пра сучасны стан і праект на будучыню. Re-Unia можа быць ключом да вывучэння няўстойлівай ідэнтычнасці Еўропы ў стане крызісу і спробай знайсці проціяддзе, якое ажывіць надзею. Гэта таксама спроба рэінтэграцыі ў постпандэмічны час, перыяд вайны ва Украіне і крызісу ў розных сферах. Re-Unia заахвоціць да задавання пытанняў пра новую супольнасць, уседамленне асобнасці і ўнікальнасці пры супрацоўніцтве. Укажа і ўмацуе нябачныя сувязі паміж краінамі Усходняй Еўропы, творчым асяроддзем, навукай, спортам і бізнэсам. Дасць магчымасць абмяняцца доследам, ведамі і крытычнымі развагамі, якія запусцяць сінэргетычныя дзеянні ў кірунку рэальнага, устойлівага развіцця горада.

Re-unia – рэінтэграцыя як натуральны ход падзей пасля дэзінтэграцыі, выкліканай пандэміяй і эскалацыяй вайны ва Украіне.

Re-unia – новае ўз'яднанне і гарманізацыя элементаў супольнасці.

Re-unia – павышэнне інтэнсіўнасці і частаты міжасабовых кантактаў.

Re-unia – прыняцце множнасці сістэм каштоўнасцей, норм і ацэнак.

Re-unia – вылучэнне аксіялагічнага набору супольнага.

Re-unia – новы, інклюзіўны грамадскі дагавор.

Re-unia – сапраўднае адчуванне супольнасці.

Нас чакае двухэтапная праца па стварэнні заяўкі на Еўрапейскую сталіцу культуры. Цяпер мы знаходзімся на этапе напісання першай тэхнічнай заяўкі, галоўная мэта якой паказаць магчымасці рэалізацыі такога маштабнага праекта. Ужо на гэты момант нам неабходна вашая дапамога. Мы ствараем рамку праграмы, якую будзем пашыраць і дапаўняць новымі творчымі праектамі на этапе падачы наступнай пашыранай заяўкі.

Дадзеная інструкцыя прызначана для ўсіх зацікаўленых асобаў, нефармальных калектываў, пазаўрадавых арганізацый, культурных установаў і фірм, чыя дзейнасць звязна з творчым працэсам, якія хочуць далучыцца да працы над заяўкай Любліна на званне Еўрапейскай сталіцы культуры 2029.

Тут Вы знойдзеце ўсю неабходную інфармацыю, якая дапаможа Вам далучыцца і падрыхтавацца да супольнага стварэння заяўкі Любліна на званне Еўрапейскай сталіцы культуры 2029. Наш поспех залежыць ад таго, ці зможам мы разам скласці праграму мерапрыемстваў у рамках Еўрапейскай сталіцы культуры 2029.

**Запрашаем усіх дасылаць свае заяўкі. На дадзены момант нам патрэбна кароткае апісанне і ўступная канцэпцыя заяўкі. Гэта будзе першы этап. Вашую заяўку будзе ацэньваць каардынацыйная група Еўрапейскай сталіцы культуры Цэнтра Культуры і дарадцы з Польшчы і Еўразвязу. Калі ў вашым праекце будзе заўважаны патэнцыял, то мы запросім Вас да ўдзелу ў другім этапе. Тады нам будзе патрэбнае больш дакладнае апісанне Вашай канцэпцыі.**

Важна памятаць, што гэта конкурс, у якім бяруць удзел многія гарады Польшчы, а выйграе толькі адзін. Мы далучаемся да яго, маючы свядомасць таго, што нават з вялікім запалам і добрай заяўкай мы можам прайграць. Аднак мы лічым, што люблінская культура вартая таго, каб зноў прадэманстраваць сваю вартасць. Падача заяўкі, падрыхтоўка ўсяго працэсу Еўрапейскай сталіцы культуры – гэта каштоўнасць сама па сабе, якая дазволіць нам сістэматызаваць нашае мысленне пра культуру, а перадусім выявіць праблемы, з якімі змагаецца наша сённяшняя культура. Сам працэс падрыхтоўкі зробіць наш культурны сектар мацнейшым.

Запрашаем Вас да актыўнага ўдзелу ў гэтым працэсе. Чакаем, што дзякуючы Вам, у нас з'явяцца новыя ініцыятывы, ідэі і праекты, як лакальнага значэння, так і агульнаеўрапейскага. Мы шукаем ідэі праектаў, рэалізацыю якіх можна будзе запусціць яшчэ да пачатку мерапрыемстваў у межах Еўрапейскай сталіцы культуры. Не завершацца яны і з момантам атрымання Люблінам звання Еўрапейскай сталіцы культуры 2029, мы разлічваем на тое, што ў перспектыве яны стануць элементамі сталага і доўгатэрміновага развіцця нашага горада і ўсяго рэгіёну. Праекты застануцца ў гісторыі конкурса на Еўрапейскую сталіцу культуры і перанясуцца на новыя, невядомыя тэрыторыі. Праграму Еўрапейскай сталіцы культуры мы ўспрымаем як стратэгічную, шматгадовую праграму. Разам мы ствараем новую аперацыйную сістэму люблінскай культуры.

## ПРАЕКТ

Калі ў Вас ёсць жаданне далучыцца да працэсу падачы заяўкі Любліна на званне Еўрапейскай сталіцы культуры 2029, у Вас ёсць ідэя і бачанне таго, як можа выглядаць культура ў Любліне ў 2029 годзе, запаўняйце заяўку і дасылайце свой праект. Праекты будуць падзелены на катэгорыі:

**a/ агульныя** – вялікія, якія будуць аб‟ядноўваць розныя ініцыятывы альбо сектары, арганізацыі, доўгатэрміновыя, стратэгічныя
**b/ індывідуальныя** – малыя, якія можна будзе ўключыць, разам з іншымі праектамі, у вялікія агульныя праекты.

Форма заяўкі знаходзіцца па спасылцы:
*https://docs.google.com/forms/d/1iWXjqkhPne5Inc0PRYilNH6dDQWQIudivAZU9sydnZs/edit*

### Прыкладны ўзор заяўкі праекта

**1. Прапанаваная назва**
**2. Катэгорыя:**
**a/ агульны**
**b/ індывідуальны / частковы**

**3. Апісанне праекта:**

### a) АГУЛЬНЫЯ ПРАЕКТЫ

У першай частцы збору заявак мы робім акцэнт на пошук агульных праектаў, шырокамаштабных, доўгатэрміновых, якія былі б разлічаныя на вялікія групы / тэрыторыі / міжнародны ахоп.

• У праграму ўвойдуць праекты, якія будуць прадугледжваць стварэнне інавацыйных, адважных мерапрыемстваў на самым высокім еўрапейскім узроўні. Наватарства і арыгінальнасць мусіць прысутнічаць не толькі ў тэорыі, але і – што больш важна – у практыцы, то бок у выкананні.

• Ідэя праекта павінна прадугледжваць дзеянні, скіраваныя на сацыяльныя змены, аказанне ўплыву на горад і ягоных жыхароў.

• Праекты павінны акрэсліваць праблему і шляхі яе вырашэння.

• Акрамя агульнага бачання і вызначэння канкрэтных дзеянняў неабходна ўлічыць таксама доўгі і каштоўны час падрыхтоўкі ў 2023-2028 гг. – як будзе выглядаць увесь працэс – узнікненне і развіццё ў 2023-2028 гадах, кульмінацыя ў 2029 годзе, працяг у 2030 і наступныя гады.

**b) ІНДЫВІДУАЛЬНЫЯ ПРАЕКТЫ – ідэі і цікавыя ініцыятывы,** якія па меры магчымасцяў будуць уключаныя ў рамкі агульных праектаў

**3. Магчымасць супрацоўніцтва.**
З кім Вы хацелі б рэалізоўваць праект, каго запрасіць у якасці партнёра. Заклікаем Вас думаць не толькі ў маштабах горада, але і Еўропы, а нават усяго свету. Да супрацоўніцтва могуць быць запрошаныя фізічныя асобы, розныя ўстановы, у тым ліку пазаўрадавыя арганізацыі, еўрапейскія партнёры.

**4. Папярэдні бюджэт** (указаць, ці існуе магчымасць фінансавання праекта не толькі горадам Люблінам, але таксама з іншых крыніц).

**5. Іншыя заўвагі, істотныя для праекта.**

**6. Кантактныя і асабістыя дадзеныя аўтара праекта.**
(імя, прозвішча альбо назва арганізацыі, тэлефон, e-mail, адрас)

**7. Калі ласка, абгрунтуйце, чаму Ваш праект павінен быць уключаны ў заяўку на званне Еўрапейскай сталіцы культуры.**

Неабавязкова адказваць на ўсе вышэй прыведзеныя пункты.
Мы гарантуем захаванне ўсіх аўтарскіх правоў.
Да разгляду прымаюцца малыя і вялікія праекты, якія ўлічваюць даступнасць для людзей з асаблівымі патрэбамі. Для нас важны кожны чалавек, і кожны варты павагі і пашаны. На этапе збору тэхнічных заявак мы правядзем адбор праектаў, падрыхтуем сінопсіс і на падставе дасланых праектных заявак сфармулюем тэматычныя абшары і агульныя праекты. На наступным этапе збору заявак частка з апісаннем праекта будзе больш разгорнутая. З'явіцца таксама адкрыты набор – грамадскі элемент заяўкі на званне Еўрапейскай сталіцы культуры.

Увага: Час падачы праектаў да **17 ліпеня 2023.**

**Ніжэй прыведзены некаторыя рэкамендацыі Камісіі ЕЗ адносна конкурса на званне Еўрапейскай сталіцы культуры:**

**ПРАГРАМА ЕЎРАПЕЙСКАЙ СТАЛІЦЫ КУЛЬТУРЫ СКІРАВАНА Ў БУДУЧЫНЮ!**

*Горад не атрымлівае звання на падставе сваёй культурнай спадчыны і актуальных прапаноў у сферы культуры. Горад атрымлівае званне на падставе праграмы Еўрапейскай сталіцы культуры, акрэсленай у заяўцы. Варта думаць пра будучыню!*

**НЕ ТАК ЯК ЗВЫЧАЙНА!**

*Некаторыя кандыдаты даслалі заяўкі, уключаючы свае ранейшыя культурныя праекты пад агульным дэвізам «Еўрапейская сталіца культуры». Яны не мелі поспеху. Званне Еўрапейскай сталіцы культуры прызнаецца на падставе дэталёвай праграмы, якая выходзіць за рамкі звычайнага культурнага жыцця горада.*

**ШАБЛОН!**

*Кожны горад выключны. Няма стандартнага шаблона для Вашай праграмы. Кожная праграма адлюстроўвае патрэбы і мэты горада пры выкананні фармальных крытэраў конкурса Еўрапейскай сталіцы культуры.*

**ЗНАЧЭННЕ ГОРАДА!**

*Адна з мэтаў праграмы – праз культуру падняць міжнародны рэйтынг горада. У большасці Еўрапейскіх сталіц культуры назіраўся рост турыстычнай актыўнасці; гэта фактар поспеху для многіх Еўрапейскіх сталіц культуры. Праграма конкурса Еўрапейскай сталіцы культуры скіроўвае сваю ўвагу перадусім на грамадзян, асабліва жыхароў горада, а таксама на іх сувязі з культурай і Еўропай.*

**ВЫКЛІКІ!**
*Горад можа кінуць выклік самому сабе. Конкурс на званне Еўрапейскай сталіцы культуры – добрая нагода для адкрытага і крытычнага вывучэння гісторыі горада, у тым ліку змрочных старонак.*
**ШАНЕЦ!**
*На кожным конкурсе выбіраецца толькі адзін горад, у сувязі з гэтым важна, каб усе гарады-кандыдаты ўжо на пачатковым этапе вырашылі, як змогуць выкарыстаць створаныя для заяўкі праекты ў выпадку, калі не атрымаюць звання.*
*Конкурс на званне Еўрапейскай сталіцы культуры складаецца з двух этапаў. У сувязі з абмежаваным часам, прызначаным на апрацоўку заяўкі (15.07.2023), просім дасылаць прапановы праектаў да* **17.07.2023.**
*Заяўка на папярэдні адбор мусіць быць пададзена да 15.09.2023*
*У выпадку пазітыўнага разгляду нашай заяўкі наступны этап працы над праграмай будзе працягвацца да вясны 2024 г.*

**З мэтай аблегчыць падачу праектаў, прапаноўваем Вам палажэнні, запісаныя ў інструкцыі для гарадоў-прэтэндэнтаў на званне Еўрапейскай сталіцы культуры. Шэраг правіл і прынцыпаў для мастацкіх, культурных і грамадскіх праектаў, якія абавязкова мусяць быць апісаныя і выкананыя.**

**1. Культурны і мастацкі змест**

*• Мастацкае бачанне і стратэгія культурнай праграмы года Еўрапейскай сталіцы культуры.*

*• Агульнае апісанне струтуры культурнай праграмы, у тым ліку спектр і разнастайнасць падзей / галоўных мерапрыемстваў, якія будуць адбывацца ў год Еўрапейскай сталіцы культуры.*

*• Кароткае тлумачэнне таго, якім чынам культурная праграма будзе спалучаць лакальную культурную спадчыну і традыцыйныя формы мастацтва з новымі, інавацыйнымі і эксперыментальнымі формамі мастацкага выказвання.*

*• Якім чынам горад заангажаваў ці як плануе заангажаваць лакальных творцаў і культурныя установы у стварэнне і рэалізацыю праграмы?*

*• Апрацаваная спецыяльна на год праграма павінна вылучацца высокай мастацкай і культурнай якасцю. Гэта датычыць як партыцыпаторных, так і большай колькасці мерапрыемстваў у межах аднаго мастацкага праекта.*

*• Праграмы конкурса на званне Еўрапейскай сталіцы культуры, як правіла, уключаюць*

*шырокі спектр мастацкіх форм, сумяшчаючы высокую і папулярную масавую культуру, падзеі, якія праводзяцца вядомымі культурнымі ўстановамі і невялікімі пазаўрадавымі арганізацымі, што адлюстроўвае рост і развіццё творчых рэакцый на праблемы горада і грамадства, захоўваюць баланс паміж бясплатнымі і платнымі мерапрыемствамі.*

*• Бачанне і стратэгія праграмы павінны адпавядаць мэтам, якія вызначае горад-кандыдат на год Еўрапейскай сталіцы культуры, і мець на ўвазе еўрапейскую перспектыву. Яны мусяць ахопліваць усю культурную праграму, а таксама звязаную з ёю дзейнасць, у прыватнасці маркетынг і камунікацыю.*

*• Еўрапейскія сталіцы культуры звычайна падзяляюць сваё стратэгічнае бачанне на некалькі напрамкаў; занадта вялікая іх колькасць можа заблытаць аўдыторыю.*

*• У форме заяўкі неабходна даць дастатковую колькасць інфармацыі на тэму прапанаваных праектаў, каб камісія магла зразумець ці адпавядае праграма і яе мастацкае бачанне стратэгіі і мэтам. Узровень дэталізацыі мусіць быць, аднак, іншы на папярэднім этапе і пры канчатковым адборы.*

*• На этапе папярэдняга адбору кандыдаты мусяць прадставіць агульны праект структуры праграмы на год, засяродзіўшы ўвагу на стратэгічным мастацкім бачанні і канцэпцыі сваёй Еўрапейскай сталіцы культуры.*

*• Пунктам выйсця для стварэння праграмы можа быць адсылка да каранёў, спадчыны і сучаснага культурнага жыцця горада. Звязана гэта з тым, што многія Еўрапейскія сталіцы культуры таксама імкнуцца да пашырэння прапаноў, звязаных з культурным жыццём горада. У апошніх справаздачах камісіі ўвага звярталася таксама на пошук інфармацыі на тэму лічбавай стратэгіі ў мастацтве Еўрапейскай сталіцы культуры.*

Калі ў Вас ёсць пытанні альбо жаданне абмеркаваць ідэю Еўрапейскай сталіцы культуры запрашаем Вас у **Зону думак пра Еўрапейскую сталіцу культуры**, якая знаходзіцца ў Цэнтры культуры (партэр, алая заля), вул. Пэавякаў 12. Чакаем Вас ад панядзелка да пятніцы ў гадз. 13.00-17.00.
Пішыце нам на адрас: *esk@lublin2029.pl*

Калі Вы не можаце самастойна запоўніць форму заяўкі праз моўны бар"ер ці іншыя перашкоды – нічога страшнага. Звяртайцеся, мы дапаможам і дашлем праект разам.

Падрабязную інфармацыю пра конкурс на польскай і ангельскай мове можна знайсці на сайце Міністэрства культуры і нацыянальнай спадчыны *https://www.gov.pl/web/kultura/nabor-2029*

*На этапе першаснай заяўкі не ўсе праекты будуць прынятыя, у выпадку пазітыўнай ацэнкі Любліна ў якасці кандыдата на Еўрапейскую сталіцу культуры-29, на фінальным этапе падачы заяўкі, які адбудзецца вясной 2024 г., праекты будуць абмяркоўвацца і дапаўняцца.*